**24.** Якія назоўнікі з прыведзеных ужываюцца толькі ў форме множнага ліку?

*1) дзверы; 2) граблі; 3) сані; 4) чаравікі.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** усе назоўнікі, акрамя 4. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**25.** Вызначце словазлучэнні з дадзеных, у якіх няправільна напісана дзеепрыслоўе:

*1) прасеянае насенне; 2) спаленыя дровы; 3) узрадаваўшаяся пасажырка.*

**А)** ва ўсіх прыкладах няправільна. **Б)** ва ўсіх прыкладах правільна.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**26.** Выберыце з прыведзеных прозвішчы мастакоў слова, радзімай якіх з'яўляецца Брэстчына: *1) Яўгенія Янішчыц; 2) Алесь Разанаў; 3) Леанід Дранько-Майсюк; 4) Раіса Баравікова.*

**А)** усе прозвішчы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 2, 3.

**27.** Якія знакі прыпынку неабходна паставіць на месцы пропускаў у сказе? *Валуны на Беларусі складаюць такую неадлучную частку ландшафту_ што_ здаецца_ прыбяры іх_ і наша прырода значна збяднее.*

**А)** чатыры коскі. **Б)** тры коскі, працяжнік. **В)** дзве коскі, двукроп'е, коска.
**Г)** двукроп'е, дзве коскі, працяжнік.
**Д)** дзве коскі, двукроп'е, коска, працяжнік.

**28.** Выберыце з дадзеных словазлучэнняў тыя, у якіх часціца ***не*** са словамі пішацца асобна: *1) стаяў у (не)рухомасці; 2) (не)змоўкны кліч; 3) (не)дужа даўно; 4) ішоў (не)спяшаючыся.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**29.** Дадзены назвы твораў: *1) "Шляхціц Завальня"; 2) "Вялікі лес"; 3) "На імперыялістычнай вайне"*. Выберыце з прыведзеных прозвішчы аўтараў адпаведна творам: *а) М. Гарэцкі; б) Я. Баршчэўскі; в) Б. Сачанка.*

**А)** 1-в, 2-а, 3-б. **Б)** 1-б, 2-в, 3-а. **В)** 1-а, 2-б, 3-в.
**Г)** 1-а, 2-в, 3-б. **Д)** 1-в, 2-б, 3-а.

**30.** Як перакладаецца на беларускую мову вядомае лацінскае выслоўе *habent sua fata libetti?*

**А)** кнігі могуць дапамагаць. **Б)** кнігі маюць свае лёсы.
**В)** чытанне неабходна. **Г)** у кнігах сіла. **Д)** без кніг жыццё немагчыма.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 14. Тыраж 5800 экз. г. Мінск. 2011 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2011»

*Чацвер, 17 лютага 2011 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

## Заданне для вучняў 11 класаў

**1.** Словы *ўзнікшы, даспелы, вывучаны* з'яўляюцца … .

**А)** назоўнікамі. **Б)** дзеясловамі. **В)** прыметнікамі.
**Г)** дзеепрыметнікамі. **Д)** дзеепрыслоўямі.

**2.** Прадоўжыце народнае выслоўе: *Шчыра сказана, як … .*

**А)** вымаўлена. **Б)** звязана. **В)** праспявана.
**Г)** пачута. **Д)** прачытана.

**3.** Выберыце з прыведзеных словы, у якіх замест кропак патрэбна ўставіць літару **д**: *1) цу..; 2) на..та; 3) а..туль; 4) напера..; 5) а..ценне.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 5.
**В)** няма правільных варыянтаў. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4, 5.

**4.** Выберыце з дадзеных словазлучэнні: *1) утрая болей; 2) сто дзевяноста чатыры; 3) будаваць дом; 4) гучна размаўляць.*

**А)** усе прыклады. **Б)** усе прыклады, акрамя 2.
**В)** няма правільных адказаў. **Г)** 1, 3. **Д)** 3, 4.

**5.** *Трохскладовая стапа з націскам на другім складзе* называецца … .

**А)** харэем. **Б)** ямбам. **В)** анапестам.
**Г)** амфібрахіем. **Д)** дактылем.

**6.** У якіх сказах з прыведзеных на месцы пропуску патрэбна паставіць коску?

*1) Усё было відаць_ як на далоні.*
*2) У такія хвіліны сустрэчы яна была для іх_ як маці.*
*3) Дні стаялі цёплыя, сонечныя_ як летам.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** ні ў адным з прыведзеных. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**7.** Дадзены словы: *1) пісьмо; 2) праца; 3) сонца; 4) моладзь; 5) песня; 6) неба.* Якія назоўнікі адносяцца да 1-га скланення?

**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 5. **Г)** 3, 6. **Д)** 4, 5.

**8.** Вызначце з прыведзеных словы з падвоенымі зычнымі:

*1) аббегаць; 2) адкрыццё; 3) вясенні;*
*4) мільённы; 5) падарожжа; 6) ранне.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 4, 5. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5, 6.

**9.** Якія словы з дадзеных маюць прыстаўку?

*1) паход; 2) палявы; 3) надзьме; 4) птушыны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3.
**Г)** 2, 4. **Д)** 1, 3, 4.

**10.** У якіх словах з дадзеных патрэбна напісаць канчатак ***-і***?

*1) ад навук..; 2) па рабоц..; 3) пра дзяўчынк..; 4) на зямл.. .*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**11.** Вызначце з прыведзеных сказы з аднароднымі дзейнікамі:

*1) Дзеці летам загаралі, купаліся, плавалі на лодцы.*
*2) Завіруха замяла стрэхі дамоў, сцежкі ў садзе, лясную дарогу.*
*3) На рабіну прыляцелі частавацца сініцы, снегіры, вераб'і.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**12.** Падбярыце з прапанаваных сінонімы да фразеалагічнага выраза *два боты пара*:

*1) аднаго поля ягада; 2) ні адсюль ні адтуль; 3) абуваць у лапці;*
*4) з аднаго цеста спечаны; 5) на адзін манер; 6) зямлі не чуць пад сабой.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 4, 5. **Г)** 2, 3. **Д)** 4, 5, 6.

**13.** Вызначце з прыведзеных тыя займеннікі, пры змяненні склонавай формы якіх змяняецца і аснова: *1) я; 2) мы; 3) яны; 4) наш.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2, 3. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3, 4. **Д)** 3, 4.

**14.** Дадзены словазлучэнні: *1) стальныя нервы; 2)тэатральны жэст; 3) лясны пейзаж; 4) вячэрняя сустрэча*. У якіх прыкладах адносныя прыметнікі ўжыты ў значэнні якасных?

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2.
**Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**15.** Якія дзеясловы з прыведзеных з'яўляюцца рознаспрагальнымі?

1*) хачу; 2) бягу; 3) стаю.*

**А)** усе дзеясловы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**16.** Выберыце з прыведзеных слоў тыя складаныя прыметнікі, якія напішаце разам: *1) бела(ружовы); 2) бела(мармуровы); 3) востра(дэфіцытны); 4) жыцця(радасны).*

**А)** усе прыметнікі. **Б)** усе прыметнікі, акрамя 1.
**В)** няма правільных адказаў. **Г)** 1, 3. **Д)** 3, 4.

**17.** Хто з беларускіх пісьменнікаў сказаў: *"Літаратура даследуе чалавека, жыццё, час"*?

**А)** Іван Шамякін. **Б)** Іван Мележ. **В)** Барыс Сачанка.
**Г)** Васіль Вітка. **Д)** Іван Навуменка.

**18.** У састаў якога члена сказа ўваходзіць выдзеленае слова ў сказе: ***Няхай*** *наша дружба мацнее?*

**А)** дзейніка. **Б)** выказніка. **В)** дапаўнення.
**Г)** азначэння. **Д)** акалічнасці.

**19.** Дадзены словы: *1) налева; 2) увысь; 3) цёпла; 4) зверху*. Вызначце прэдыкатыўнае прыслоўе.

**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**20.** У якім творы Уладзімір Караткевіч напісаў: *"Над усёй нашай краінай, наставіўшы белыя ветразі крылаў, плануюць буслы…"*?

**А)** "Зямля пад белымі крыламі".
**Б)** "Балада пра Вячку, князя людзей простых".
**В)** "Каласы пад сярпом тваім".
**Г)** "Дзікае паляванне караля Стаха". **Д)** "Лісце каштанаў".

**21.** Выберыце з прыведзеных назоўнікі ніякага роду:

*1) ронда; 2) аташэ; 3) рэгбі; 4) рэвю.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** усе назоўнікі, акрамя 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 2, 3, 4.

**22.** Якія словы з дадзеных напішаце з раздзяляльным мяккім знакам?

*1) аб..езд; 2) батал..ён; 3) сур..ёзны; 4) васіл..кі; 5) л..ецца; 6) школ..нік.*

**А)** усе словы. **Б)** усе словы, акрамя 1. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 5. **Д)** 4, 6.

**23.** Героямі якога твора з'яўляюцца Вольга Андросава і Янка Тукала? Выберыце правільны варыянт.

**А)** Янка Купала "Паўлінка". **Б)** Янка Купала "Тутэйшыя".
**В)** Якуб Колас "На ростанях". **Г)** Васіль Быкаў "Знак Бяды".
**Д)** Кандрат Крапіва "Хто смяецца апошнім".